# УСЕБЕЛАРУСКІ СТАРАСТА



**Да 75-годдзя з дня нараджэння А. Р. ЧАРВЯКОВА**

Не было ў Беларусі кутка, дзе б не ведалі Алеся Рыгоравіча Чарвякова, старшыню Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР, ці ўсебеларускага старасту, як любоўна называлі яго рабочыя і сяляне. Ён часта бываў на прадпрыемствах, гутарыў з рабочымі і сялянамі, настаўнікамі і чырвонаармейцамі. Яго ведалі і дзеці і дарослыя. Дзесяткі калгасаў, школы, дзіцячыя дамы насілі яго імя. У

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

| | |
|---|---|
| 7 | 50 гадоў з дня нараджэння (1917) мастака Ф. Ф. Зільберта. |
| 9 | 25 гадоў назад (1942) Дзяржаўны Камітэт Абароны СССР прыняў пастанову аб утварэнні Беларускага штаба партызанскага руху. |
| 10 | 50 гадоў з часу арганізацыі (1917) у Оршы рэвалюцыйнага атрада для барацьбы з карнілаўшчынай. |
| 12 | 50 гадоў назад (1917) у Мінску створан Часовы ваенна-рэвалюцыйны камітэт Заходняга фронту па барацьбе з карнілаўшчынай. |
| 14 | 50 гадоў назад (1917) у Мінску адкрыўся Заходнефрантавы і абласны сход РСДРП(б). |
| 15 | 45 гадоў назад (1922) Саўнарком БССР прыняў рашэнне аб адкрыцці ў Мінску Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі (цяпер імя У. І. Леніна). |
| 20—23 | 15 гадоў назад (1952) у Мінску працаваў XX з'езд Кампартыі Беларусі. |
| 28 | 50 гадоў з дня выхаду (1917) першага нумара газеты «Молот», органа Паўночна-Заходняга бюро РСДРП(б), замест закрытай Часовым урадам газеты «Звезда». |
| **28 верасня — 1 кастрычніка** | 50 гадоў назад (1917) у Мінску працавала І Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РСДРП(б). Канферэнцыя выбрала Паўночна-Заходні абласны камітэт РСДРП(б). |

некаторых вайсковых часцях ён быў залічаны ганаровым чырвонаармейцам.

Нарадзіўся Алесь Рыгоравіч 8 сакавіка 1892 года на Міншчыне ў вёсцы Дукорка Пухавіцкага раёна. Хата, дзе жылі яго бацькі, не захавалася. Аднойчы, у 1924 годзе, едучы па дарозе, А. Р. Чарвякоў паказваў Міхасю Чароту месца, дзе некалі стаяла яго «маленькая, пагорбленая і ўся струхнелая хата». Зямлі было мала, і бацька Алеся, пакінуўшы яе двум сваім братам, працаваў спачатку ў панскім маёнтку, а потым пераехаў у горад. Там Алесь з малых год вучыўся ў царкоўна-прыходскай школе і ў гарадскім вучылішчы. Вучыўся добра. З чатырнаццаці гадоў сам здабываў сродкі на вучобу і жыццё. Закончыўшы вучылішча, вытрымаў экзамен на званне народнага настаўніка і тры гады працаваў у Трокскім павеце Віленскай губерні. Пасля зноў вучыўся ў Віленскім настаўніцкім інстытуце, працаваў у школах для дарослых, у вышэйшым пачатковым вучылішчы пры інстытуце.

Другі год ішла імперыялістычная вайна. 1 кастрычніка 1915 года А. Р. Чарвякоў быў мабілізаваны ў царскую армію. Паслужыўшы некалькі месяцаў, ён, як чалавек з адукацыяй, адкамандзіроўваецца ў маскоўскае Аляксандраўскае ваеннае вучылішча. Улетку 1916 года, прайшоўшы паскораны курс навучання, атрымлівае чын прапаршчыка і залічваецца ў 11-ы пяхотны Сібірскі стралковы запасны полк. Знаходзячыся ў арміі, Чарвякоў прымае ўдзел у рабоце рэвалюцыйных гурткоў. У лютым 1917 года перад адпраўкай на фронт Чарвякова накіроўваюць у Араніенбаўм (пад Петраград) у афіцэрскую школу на курсы кулямётчыкаў. Тут і застала яго лютаўская рэвалюцыя. У агні рэвалюцыйных падзей ён знаёміцца з бальшавікамі, працуе ў армейскіх арганізацыях і ў маі 1917 года ўступае ў партыю.

Неўзабаве распараджэннем Ваенрэўкома яго адкамандзіроўваюць у Беларускі бежанскі камітэт. 14 лютага 1918 года Алесь Рыгоравіч прызначаецца камісарам па беларускіх справах пры Саўнаркоме РСФСР, дзе працуе да ліпеня 1918 года. Тут працавалі ў той час Змітрок Жылуновіч, Браніслаў Тарашкевіч і іншыя. Ужо на адным з першых пасяджэнняў Беларускага нацыянальнага камісарыята было пастаўлена пытанне аб адкрыцці ўніверсітэта ў Беларусі.

Улетку 1918 года па партыйнай мабілізацыі А. Р. Чарвякоў прызначаецца камісарам адной з дывізій Чырвонай Арміі, але па дарозе да месца службы трапляе ў шпіталь, бо цягнік, на якім ён ехаў, пацярпеў крушэнне. Пасля

| | |
|---|---|
| 30 | 10 гадоў з дня пуску (1957) Магілёўскага металургічнага завода імя Мяснікова. Завод выпусціў першы беларускі пракат. |
| 30 | 60 гадоў з дня нараджэння (1907) паэта С. С. Дзяргая. |

**КАСТРЫЧНІК**

| | |
|---|---|
| 14—16 | 50 гадоў назад (1917) праходзіла I Віцебская губернская канферэнцыя бальшавікоў. |
| 15 | 50 гадоў з дня нараджэння (1917) заслужанай артысткі БССР Л. С. Веснiной. |
| 15 | 60 гадоў з дня нараджэння (1907) пісьменніка Р. К. Сабаленкі. |
| 18—20 | 50 гадоў назад (1917) у Мінску праходзіла II Надзвычайная Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РСДРП(б). |



З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы